# ПЕРШЫЯ ГІСТАРЫЧНЫЯ ТВОРЫ УЛАДЗІМІРА КЁРНЕРА: МАСТАЦКАЯ АДМЕТНАСЦЬ, НАВАТАРСТВА

Вострыкава А.У.
Беларускі дзяржаўны універсітэт

Уладзімір Кёрнер – знакаміты чэшскі пісьменнік другой паловы XX стагоддзя. Ён належыць да тых аўтараў, хто ў другой палове 60-х гг. змяніў вобраз чэшскай гістарычнай прозы і ініцыіраваў новыя падыходы да гістарычнай тэмы, вызначыў шляхі развіцця гэтага жанру ў наступныя дзесяцігоддзі разам з Ольджыхам Данекам і Іржы Шоталай. Візуалізацыя вобразаў набліжае манеру Кёрнера да твораў Уладзіслава Ванчуры. Чэшскі творца вылучыўся ў сваіх гістарычных раманах скептычным стаўленнем да ролі асобы ў гісторыі, а таксама шырокім скарыстаннем лірычных пластоў аповеду. Наватарства чэшскага творцы праявілася ўжо ў яго першым гістарычным рамане “Пясчаная каса”(1970) і прымыкаючай да яго аповесці “Даліна пчол” (1978), якая першапачаткова была кінасцэнарыем. Дарэчы, на паэтыку твораў паўплывала прафесія сцэнарыста, якую меў Кёрнер: яго апавядальная манера выразна візуальная, ён звяртаецца да чытача з дапамогай вобразаў і іх візуальнай энергіі.

У вылучаных творах апісваюцца падзеі XIII стагоддзя, звязаныя з паходамі крыжакоў на ўзбярэжжа Балтыйскага мора, туды, дзе жыло язычніцкае племя прусаў. Нямецкія рыцары хочуць прынесці язычнікам-прусам хрысціянства. Аснову сюжэта складае гісторыя лёсу мараўскага рыцара Алвіна, пайшоўшага па шляху сва        його бацькі, які не вярнуўся з крыжацкага паходу. Алвін параненым пападае ў палон. Яго ратуюць прусскія жанчыны. Душэўнае вызваленне ён таксама шукае ў акаляючай яго балтыйскай прыродзе. Фінал рамана вельмі трагічны, паколькі галоўнага героя ўрэшце рэшт забіваюць у бітве з татарамі. Кампазіцыя твора вельмі прадуманая і паслядоўная. Ён складаецца з пралога, трох частак і эпілога.

Кожная частка суправаджаецца эпіграфам са сярэднявечнай нямецкай літаратуры.

Для напісання рамана Кёрнер вывучаў спецыяльныя гістарычныя крыніцы. Яго вельмі натхніла паездка ў крэпасць Мальбарк і гатычную Тарунь. Яго твор дастаткова канкрэтны, паколькі ўказваецца месца і час дзеяння асобных эпізодаў. Ён надае шмат увагі жыццю нямецкіх рыцараў у Прыбалтыцы, але не забывае пра праблемы чалавечай экзістэнцыі. Хаця "Пясчаная каса" – першая кніга на гістарычную тэму, напісаная чэшскім пісьменнікам, аднак ён бярэ многія тэмы са сваёй папярэдняй "ваеннай" прозы, а вобразы герояў пэўным чынам працягваюць галерэю сваіх папярэднікаў у іншых творах. Кёрнер падкрэслівае, што не імкнецца пісаць класічную гістарычную белетрыстыку, заснаваную на пэўных датах, што яго стаўленне да крыніц вельмі вольнае [2, с.15]. Так, у згаданым рамане падзеі лакалізаваны ў XIII стагоддзіі, яны звязаны з Ордэнам нямецкіх рыцараў і той роллю, якую ён адыгрываў на Прусскіх землях, але цэнтральная гісторыя Алвіна з Совінце з'яўляецца пазачасавым выпадкам пошукаў сэнсу, вечнай людской тугі па абсалюту, якая праз шэраг матываў падаецца як гнастычны падыход чалавека да свету. Не зважаючы на тое, што ў творы шмат амаль апакаліптычных вобразаў, яго нельга назваць безвыходным і паўным выключна безнадзейнасці. Раман экспрэсіўны. Аўтар яго балансуе паміж рацыяналізмам і містыцызмам. Мэтай чэшскага пісьменніка бачыцца адлюстраванне тых духоўных каштоўнасцей, якія шукаў сярэднявечны чалавек і суаднясенне іх са шляхамі і экзістенцыяльнымі пошукамі чалавека сучаснага. Вечнасць і бясконцасць у рамане часта сімвалізуюцца праз матывы мора і пустыні, духоўнай прагі і матыў пяску.

Галоўнымі тэмамі "Пясчанай касы" становяцца экзістэнцыяльныя тэмы вернасці і здрады, помсты і адзіноты. Галоўны герой Алвін шукае сэнс жыцця, веру, каханне і сяброўства. Спрабуе вызначыць сваё стаўленне да

радзімы і бацькоў. Пісьменнік у сваім рамане падвяргае яго выпрабаванню тугой. Ставіць Алвіна у сітуацыю канфрантацыі душы і цела. Ён сутыкаецца з рознымі праявамі зла і фанатызма. Алвін падаецца ў рамане чалавекам, жыццёвы шлях якога трагічна вызначаны. Ён з дзяцінства сутыкаецца з жорсткасцю жыцця, становіцца сведкам таго, што гэты свет – свет катаў і іх ахвяр, волкаў і ягнят. Ён знаёміцца з рознымі жыццёвымі мадэлямі, але ні ў воднай не знаходзіць сябе. Яго лёс становіцца кароткім момантам паміж двайным небыццём. Душэўны адпачынак і ўнутраную падтрымку цэнтральны персанаж знаходзіць часта ў прыродзе, з якой адчувае нейкую языцніцкую з’яднанасць. Гэтае адзінства з прыродай дэманструецца ў рамане праз галоўны матыў пясчанай касы, якая двойчы выратавала жыццё Алвіна. Яшчэ яна сімвалізуе часавасць чалавечага жыцця і аднакратнасць, непаўторнасць чалавечага існавання.

Наватарства Уладзіміра Кёрнера ў тым, што ён не столькі хацеў дакладна паказаць гістарычныя падзеі, колькі праз старажытнасць даследаваць сучаснасць, адлюстраваць актуальныя для яго чытачоў псіхалагічныя перыпітыі жыцця, лічыць чэшскі даследчык Уладзімір Новатны [3, с.9]. Мы не можам правесці празмерана прамых аналогій з тагачаснай чэхаславацкай гісторыяй, але тая трагічная танальнасць, якая адпавядае раману, нагадвае настроі, што панавалі ў грамадстве пасля падзей жніўня 1968 г. Калі абстрагавацца ад падзей XIII стагоддзя, то можна вылучыць канфлікт чалавека і грамадскіх структур, праблему імкнення кожнага чалавека да індывідуальнай свабоды і супрацьпастаўлення асобнага чалавека і калектыва з пэўнай ідэалогіяй. Пісьменнік, апісваючы Прыбалтыйскія землі XIII стагоддзя, тым не меньш скіраваны на рашэнне пазачасавых пытанняў чалавечага быцця.

Паэтыка рамана “Пясчаная каса” надзвычай багатая. Прыгожа апісваюцца балтыйскія пейзажы. Прысутнічае адлюстраванне сноў і бачанняў героеў твора. Гэтаму адводзіцца вялікая прастора ў тканіне

празаічнага твора. Галоўны мастацкі сродак Кёрнера – гэта апісанні. Дыялогі і маналогі сваіх герояў ён зводзіць да мінімума. Аднак падрабязна ўзнаўляюцца пачуцці, ілюзіі, успаміны персанажаў. Знайшло сваё месца ў творы і веданне аўтарам Бібліі, а таксама дакументальных гістарычных сведчанняў таго часу.

"Даліна пчол" – гістарычная навэла пра марнасць чалавечых імкненняў супрацьстаяць гвалту і фанатызму, дзеянне якой адбываецца пасля смерці караля Пршэмысла Отакара ІІ у часы апошніх крыжовых паходаў у чэшскіх мястэчках Влкаў і Ланшперк, а таксама ў замку Штум і на прусскіх землях, што належалі Ордэну нямецкіх рыцараў. Твор сэнсава і сюжэтна цесна прымыкае да рамана "Пясчаная каса". Навэла мае строгую сіметрычную пабудову. Пачынаецца і заканчваецца сцэнай вяселля, якое ў абоіх выпадках выліваецца ў крывапраліцце. Твор мае дзве часткі, якія ўтвараюць выразную цэласнасць. Аднак часткі пабудаваны на кантрасце: з прабалтыйскай краінай звязаны матывы дажджу, холаду, шэрага неба, марскіх хваль; радзіму героя характарызуюць вобразы, азораныя сонцам і насычаныя гудзеннем пчол.

Галоўны герой гэтай "баладычнай гісторыі кахання і нянавісці" [4,с.5], малады земан Онджэй з Влкава, аказваецца паміж двума супрацьлеглымі вобразамі ў творы: братам Ордэна Армінам фон дер Хэйдэ – шукальнікам духоўнай чысціні, які хацеў бы пазбавіць свет ад усяго нізкага і цёмнага і які  забівае свайго сябра таму, што хоча захаваць яго для вечнага жыцця, і мачахай Ленорай – ідэалам жаноцкасці. Ён знаходзіць прыгажосць роднай "даліны пчол". Падчас вяселля з нагоды другога шлюба свайго бацькі ён падае нявесце кошык з лятучымі мышамі, укрытымі кветкамі. Раз'юшаны бацька ледзь не забівае хлопца, а потым абяцае яго Богу. З гэтага ўсё і пачынаецца. Кантрасныя характары маюць вобразы ваўкоў і пчол, якія з'яўляюцца ў назвах частак твора. Ваўкі пажыраюць адно аднаго. Пчолы сімвалізуюць сабой стваральны пачатак, у навэле яны – сімвал радзімы.

Вобразы ваўкоў таксама суадносяцца як з жорсткасцю язычніцкага ладу жыцця, так і з нецярпімасцю хрысціянства супраць паганцаў. “Воўчая” сімволіка звязана таксама з галоўным героем (гэта назва яго роднага маёнтка). У навэле аповяд ал трэцяй асобы аўтар камбінуе з дыялогамі. Апавядальнік не нейтральны, часта ён дазваляе сабе саркастычныя заўвагі. Душэўны стан персанажаў праецыруецца на прыроду.

Гістарычная проза Уладзіміра Кёрнера – гэта варыяцыі на тэму бяссілля чалавека перад “вялікай гісторыяй”, якая атаясамліваецца ў чэшскага аўтара перш за ўсё з войнамі, гвалтам і лёсавызначальнай чалавечай слепатой. Адносіны чалавека і гісторыі аўтар бачыць вельмі трагічна. Чалавечае жыццё нагадвае блуканне па кругу, калі герой вяртаецца на старыя месцы і да старых абставін, якія былі для яго прадвызначаны. У гэты сэнсе няма розніцы паміж творамі, напісанымі пра Другую альбо Першую сусветную вайну і творамі аб больш далёкай часава гісторыі, паміж яго раманамі і навэламі, на думку літаратуразнаўцы Ё.Адама [1.c.4]. Знешняя рэальнасць у творах фігуруе як сугестыўная паралель унутранага свету, пейзажы і ландшафты становяцца хутчэй пейзажамі і ландшафтамі душы, чым аўтэнтычным вобразам канкрэтнай геаграфічнай прасторы. Многія творы Кёрнера былі экранізаваны.

**Літаратура**


1. Adam J. Thanatos aneb Soumrak řádovych rytířů.—MF, 10.12.1970.-S.4.
2. Dvořák J. Historická balada jako zpověď.—Texty, 1971, č. 2.-S.15-17.
3. Novotny V.Reliéf davnověku.—Tvorba,1979, č.12.-S-9-11.
4. Poláček J. Přiběh lásky a nenávisti.—Rt, 20.9.1978. –S.5.